# СВЕТ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ Ў АПАВЯДАННІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА «БЕЛАЯ САРОКА»
## Адкрыты ўрок беларускай літаратуры ў 9 класе

**Т. В. Калеснікава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
ліцэя пры Гомельскім інжынерным інстытуце
Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь

**Тэма:** Свет беларускай міфалогіі ў апавяданні Яна Баршчэўскага «Белая Сарока».

**Мэты:**

- асэнсаванне вучнямі ідэйнага зместу алегарычнага апавядання «Белая Сарока» і яго мастацкіх асаблівасцей;
- стварэнне ўмоў для ўсведамлення навучэнцамі ролі алегорыі ў апавяданні;
- засваенне вучнямі сэнсу міфалагічных вобразаў у апавяданні, разуменне сімволікі вобраза;
- фарміраванне ўменняў аргументаваць уласную думку, працаваць самастойна і ў групе;
- выхаванне любові да Радзімы праз паказ хараства духоўнага свету чалавека, які трымаецца народных традыцый і звычаяў.

Чытаючы творы Яна Баршчэўскага, мы спасцігаем сваю гісторыю,
светапогляд беларуса першай паловы XIX ст., саміх сябе.
***Мікола Хаўстовіч***

### Ход урока

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

***1) Паведамленне тэмы і мэты ўрока***

***2) Уступнае слова настаўніка***

***Настаўнік.*** Апавяданне, якое мы будзем сёння вывучаць, таксама было змешчана ў незвычайна кнізе Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Чаму я назвала кнігу незвычайнай? (*Вобраз Беларусі паўстае ў казачным, фантастычным свеце дзякуючы сувязі апавяданняў з беларускай міфалогіяй.*) Чаму крытыкі лічаць яе <u>*галоўнай*</u> у творчасці пісьменніка? (*Гэта кніга пра Беларусь: геаграфічнае апісанне, гісторыя краіны, народ, характар беларуса, яго светапогляд.*) Чаму пісьменнік так шчыльна звязаў сваю кнігу з беларускай міфалогіяй і фальклорам? (*Там бачыў пісьменнік крыніцу ведаў аб гісторыі нашай зямлі, характары і пачуццях беларусаў, крыніцу ведаў аб спрадвечных маральных каштоўнасцях народа.*)

## II. Работа над зместам апавядання

***1) Актуалізацыя суб'ектнага вопыту вучняў***

***Настаўнік.*** Сапраўды, чытаючы творы Яна Баршчэўскага, мы спасцігаем сваю гісторыю, светапогляд беларуса 1-й паловы XIX ст., саміх сябе. Як бачым, аўтар для сваёй творчасці ўзяў вусна-паэтычную культуру народа – фальклор. Ён разумеў, што менавіта ў фальклоры, у першапачатковай чысціні захаваліся спрадвечныя ісціны, тое разуменне дабра і зла, тыя каштоўнасці, якія характэрны для беларускага народа.

Задумайцеся над паняццем «каштоўнасці». Як разумееце сэнс гэтага слова? «**Каштоўнасці** – з'явы як матэрыяльнага, так і духоўнага характару, якія валодаюць станоўчым значэннем, гэта значыць здольнасцю задавальняць патрэбнасці чалавека, грамадства, служаць іх інтарэсам і мэтам »**.**

Якія каштоўнасці – матэрыяльныя (грошы, маёмасць) ці духоўныя (веды, вера, дабрыня, праца, любоў да роднага краю, каханне) – з'яўляюцца найбольш важнымі для вас?

Сёння на ўроку мы будзем **асэнсоўваць апавяданне «Белая сарока»,** у якім і галоўны герой пан Скамароха, і сам аўтар выказваюць сваё разуменне вартасці **сапраўдных і падманных каштоўнасцей**.

***2) Літаратурны дыктант***

***Настаўнік.*** А цяпер звернемся да зместу апавядання «Белая сарока» і адкажам на пытанні, якія змешчаны ў табліцы. Свае адказы вы будзеце запісваць у калонку.

| **Пачатак сказа** | **Працяг-адказ** |
|---|---|
| *Дзе, каля якога возера, знаходзіўся маёнтак, у якім жыў пан?* | каля возера Язна |
| *Хто галоўныя героямі твора?* | пан Скамароха, Белая Сарока |
| *Хто неадступна быў радам з панам?* | вялізны чорны сабака |
| *Хто такая Белая Сарока?* | мацнейшая за ўсіх чарнакніжнікаў чараўніца |
| *Што рабіў пан, каб паклікаць лёкаяў?* | свісцеў |
| *Што ахвяравала пану ў падарунак Белая Сарока?* | велізарны мех золата |
| *Калі Белая Сарока з'ўлялася ў пакоі пана?* | апоўначы |
| *З'яўленне нячыстай сілы суправаджаецца?* | сполахамі маланак і ўдарамі грому |
| *Хто такія ваўкалакі?* | гэта людзі, перавернутыя ў ваўкоў |

Праверце свае адказы і падыміце рукі тыя, хто правільна адказаў на ўсе пытанні.

## III. Работа над ідэйным зместам апавядання

***1) Аналітычная гутарка***

- ✓ Як жыў пан Скамароха? Раскажыце пра яго нораў, лад жыцця, адносіны да падначаленых.

*(«…быў надзвычай неспакойнага нораву, фанабэрлівы і хцівы, да суседзяў ездзіў толькі з прэтэнзіямі, меў грошы і заўсёды судзіўся, крыўдзіў бедных, удоў і сірот. Яго падданыя мелі пекла на гэтым свеце.»)*

- ✓ А цяпер пазнаёмімся з незвычайным госцем, які з'явіўся ў пакоі пана Скамарохі (*слоўны малюнак*).
- ✓ Чаму пасланец Белай Сарокі прыляцеў менавіта да Скамарохі і чым спакусіў яго?

*(Таму што Скамароха толькі і думаў пра розныя спосабы павелічэння сваіх уладанняў, хацеў мець многа грошай, <u>быў хцівы і заўсёды судзіўся.</u> Пасланец Белай Сарокі адразу сказаў, што ён падобны да пана Скамарохі і можа шмат чаго добрага для яго зрабіць. Ён даведаўся пра жаданне Скамарохі павялічыць свае ўладанні і вырашыў, што зможа дапамагчы Скамароху. А спакушае ён Скамароху багаццем, шчасцем, якія можа даць Скамароху Белая Сарока, калі пан добра прыме яе ў сваіх пакоях і ва ўсім будзе спрыяць ёй. Пан Скамароха «золата любіў так, што хацеў мець яго як мага болей, няхай сабе і з шатанавых рук, і прыгажосць Белае Сарокі вабіла яго. Хацеў пабачыць яе як найхутчэй і быць у ліку яе прыяцеляў».)*

- ✓ Дайце апісанне Белай Сарокі, якая ў хуткім часе наведала Скамароху (*слоўнае маляванне*). З якой мэтай прыляцела яна ў наш край?
- ✓ Як Скамароха характаразуе наш край і жыццё тутэйшых сялян? У чым праўдзівасць, а ў чым адсутнасць праўды ў яго словах?
- ✓ Чаму пан Скамароха быў так шчодра ўзнагароджаны Белай Сарокай?
- ✓ Што адбылося з ім у канцы апавядання? Ці заканамерныя гэтыя змены?
- ✓ Якія змены пачалі адбывацца ў ваколіцах пасля апошняга візіту Белай Сарокі?

## IV. Фізкультхвілінка

***Зарадка для вачэй***

Выцягніце правую руку ўперад, падніміце ўверх перад сабой указальны палец, трымаючы яго на ўзроўні вачэй. Глядзіце на кончык вашага пальца і паступова набліжайце яго да вачэй.

***Псіхалагічны трэнінг***

Заплюшчыце, калі ласка, вочы і падумайце аб самым прыемным выпадку ў вашым жыцці. Расплюшчваем вочы. А зараз давайце ўсміхнёмся адзін аднаму і з цудоўным настроем працягнем нашу працу.

**2) *Работа ў групах***

У кожнай групы ёсць картка з заданнем. Група 1 карыстаецца падручнікам па гісторыі; групы 2 і 3 «Слоўнікам літаратуразнаўчых тэрмінаў»; група 4 падручнікам па літаратуры.

**Заданні для груп**

**Група 1.**

✓ Якія гістарычныя абставіны ў Беларусі XIX ст. паўплывалі на зварот Яна Баршчэўскага да беларускай міфалогіі?

*(У 1834 г. царскім указам была забаронена назва Беларусь, усе школы пераведзены на рускую мову. Ян Баршчэўскі змяшчае гэты тэрмін на тытульным аркушы сваёй кнігі. Беларусь для яго існуе толькі ў марах, уяўленнях, фантастычных апавяданнях, але яна ўжо ёсць, яна ўжо існуе.*)

**Група 2.**

✓ Дайце азначэнне паняцця «алегорыя». Які іншасказальны сэнс укладае Ян Баршчэўскі ў вобраз Белай Сарокі?

(***Алегорыя** – іншасказанне, ўвасабленне ў канкрэтным мастацкім вобразе абстрактнага паняцця, выраз якой-небудзь адцягненай ідэі.*

*Найбольш складаны вобраз у апавяданні. І колер, і сама птушка ўяўляліся як сімвалы процілеглых сіл. У апавяданні Баршчэўскага абодва элементы ўжыты з адмоўным значэннем. Белы колер тут сімвалізуе замагільны свет, пустату, смерць, а па народных павер'ях у сароку можа ператварыцца ведзьма. Сама птушка ў прыродзе плямістая, рабая (у павер'ях – адзнака нячыстай сілы). Таму і пераапранаецца яна ў цалкам белыя пёры, хоча быць прывабнай. У міфалагічныя матывы Ян Баршчэўскі ўклаў сваё аўтарскае ўяўленне, бо чараўніца Белая Сарока – гэта сама ўладальніца вялікай краіны, царыца Кацярына ІІ.)*

✓ Якое зло пакінула Сарока на нашай зямлі?

( *Хоць злая чараўніца, «чуючы людскія праклёны, адляцела далёка і больш не з'яўлялася ў нашым краі, ...але зло, якое яна пакінула, распаўзлося па ўсім наваколлі». Зло гэтае пасялілася ў людзях, што забыліся аб сваіх душах, сваіх блізкіх, сваім краі і пачалі клапаціцца толькі пра матэрыяльны дастатак.*)

**Група 3**.

✓ Дайце азначэнне паняцця «алюзія». На якое становішча панства і сялянства намякае Ян Баршчэўскі? У чым сутнасць здрады панства?

(**Алюзія** – мастацкі прыём, сутнасць якога заключаецца ў суаднясенні намёкам падзеі, якая адбываецца і апісваецца ў творы, з вядомай чытачу інфармацыяй, звязанай з гістарычным ці міфалагічным фактам для рэалізацыі мастацкай задумы і раскрыцця ідэі твора.

*У апавяданні аўтар праводзіць рысу паміж панамі і простым народам. Першыя ў большасці адвярнуліся ад свайго народа і клапоцяцца аб тым, як абагаціцца. Праўда, былі і іншыя паны, якія не падзялялі захапленне Скамарохі Белаю Сарокаю. Прыхільнікі Белай Сарокі ператварыліся ў порсткіх звяркоў, мядзведзяў, ваўкалакаў, яія прыносяць шкоду працоўнаму чалавеку.*)

✓ Якую думку паводле гэтага хоча данесці да чытача аўтар апавядання?

(*Паны, губляючы сувязь са сваім народам, аддаляючыся ад каштоўнасцей, веры, прадаюць душу злым сілам, здраджваюць роднай зямлі, свайму краю.*)

**Група 4**.

✓ Які іншасказальны сэнс укладвае Ян Баршчэўскі ў наступныя міфалагічныя вобразы: Чорны сабака, Акно, Бліскавіцы і перуны?

*(Згодна старажытным народным павер'ям, гэтая істота лічылася абаронцам чалавека ад злога духа, нячысціка. Але ў Яна Баршчэўскага* ***Чорны сабака*** *пана Скамарохі дзіўным чынам засынае і не можа перашкодзіць пасланцу Белай Сарокі. Магчыма, аўтар хоча падкрэсліць, што які гаспадар, такі і сабака. Скамароха ўнутрана гатовы звязацца з нячыстай сілай, таму і сабака яго спіць і не рэагуе на з'яўленне злога духа. У народзе лічылася, што* ***акно*** *– небяспечнае месца ў доме. Таму каб у хату не трапілі нячысцікі, вокны нанач хрысцілі, напярэдадні свята Вадохрышча над імі з надворку малявалі крыжы. У апавяданні менавіта так, праз акно, пранікаюць у пакой Скамарохі пасланец і сама Белая Сарока. Гэта сведчыць, што гаспадар дома даўно ўжо адышоў ад народных традыцый засцярогі ад нячыстай сілы. У беларускай мове словы «бліскавіца і перуны» ўжываюцца ў значэнні «маланка», «****маланка і гром****». Вярхоўны бог старажытных славян Пярун, раз'язджаючы па небе, пасылае на зямлю маланкі, каб знішчыць носьбітаў нячыстай сілы – чарцей і ведзьмаў. Таму тыя і хаваюцца пад дахі, кідаюцца ў жытло людзей, уцякаючы ад пакарання. Такі прытулак злыя духі знайшлі ў доме пана Скамарохі.)*

**3)** ***Інсцэніроўка*** (*развітальная размова Яна Баршчэўскага, які ў маладым узросце выпраўляўся ў дарогу, і дзядзькі шляхціца Завальні*)

Размова з навучэнцамі пасля інсцэніроўкі:

✓ На якія сапраўдныя каштоўнасці, што з'яўляюцца самымі важнымі ў жыцці і перадаюцца беларусамі з пакалення ў пакаленне, раіць звярнуць увагу пісьменнік?

✓ Якія з іх вы можаце дадаць у лік тых, што будуць самымі важнымі ў вашым жыцці?

***4) Абагульненне (ідэйны сэнс)***

Кніга Я. Баршчэўскага напісана на польскай мове, але яна адрасавана адукаваным землякам, якія не ведалі роднае мовы, адцураліся ад яе. А адрокшыся ад свайго народа, чалавек не можа ведаць яго традыцый, звычаяў, яго душу, не можа зразумець яго філасофію. Такія людзі з пагардаю глядзяць на ўсё сваё, яны не ведаюць свайго і не прызнаюць за ім ніякае вартасці. Я. Баршчэўскі сваім творам і сваёй творчасцю імкнуўся пазнаёміць суайчыннікаў з уяўленнямі простага люду, філасофіяй яго паняццяў. Народ, які стварыў такую высокамастацкую, паэтычную культуру, заслугоўвае павагі.

**V. Рэфлексія**. (Метад «Рэфлексійная мішэнь»)

***Настаўнік.*** А зараз у вас будзе магчымасць падзяліцца сваімі ўражаннямі аб сённяшнім уроку. Ці задаволены сваёй працай на ўроку? Працай сваіх таварышаў? Як ацэньваеце форму ўрока?


Твая дзейнасць на ўроку
Дзейнасць таварышаў
Наколькі табе спадабалася форма ўрока
Наколькі ўрок аказаўся карысным